**Інфарм-укол**

## Вораг фігуры — лішак тлушчу

**На сёння медыкі перакананы, што галоўная прычына лішняй вагі — лішак тлушчаў у харчаванні. Чаму ж тлушчы спрыяюць прыбаўцы вагі?**

Пачуццё сытасці ўзнікае ў чалавека тады, калі сценкі страўніка злёгку расцягваюцца ад перапаўнення. Калі ж гэта дасягаецца за кошт тлустай ежы, то варта мець на ўвазе высокую энергетычную каштоўнасць апошняй. Лішак тлушчу, вядома, адпраўляецца ў падскурную тлушчавую клятчатку.

Пачуццё насычэння, якое ўзнікае ў нас пасля абеду, вызначаецца таксама ўсмоктваннем і акісленнем спажыўных рэчываў, выдзяленнем асобных гармонаў. Вучоныя выявілі, што ў поўных людзей гэтыя працэсы парушаны, і таму ім цяжка правільна кантраляваць ужыванне ежы. Акрамя таго, бялок лепцін, які вырабляецца ў тлушчавых клетках, паступае ў кроў, а потым у мозг, і сігналізуе аб назапашаным у арганізме тлушчы, у таўсцякоў прынікае ў мозг у той жа колькасці, што і ў худых. Пры гэтым мозг «лічыць», што тлушчавых тканак у арганізме менш, чым насамрэч, і чалавек не губляе апетыту нават тады, калі ўжо наеўся.

Немалую ролю адыгрывае і тое, што тлустыя прадукты ўспрымаюцца як больш смачныя: духмяныя рэчывы, якія надаюць смак і апетытны пах прадуктам, раствораны галоўным чынам у тлушчах. Таму абястлушчанае малако або тварог здаюцца нам нясмачнымі. І тым не менш, для зніжэння лішняй вагі неабходна абмежаваць менавіта ўжыванне тлушчаў. Хоць многія лічаць, што ёсць і іншыя шляхі — заняткі спортам.

### Фізічныя нагрузкі

**Фізічныя нагрузкі — гэта спосаб прымусіць тлушчавыя клеткі спальваць тлушч. Але фізічная актыўнасць сама па сабе не з'яўляецца эфектыўным спосабам зніжэння масы цела. Іншымі словамі, каб пахудзець за тыдзень на 900 г, можна зменшыць колькасць ужытых калорый на 1000 адзінак у дзень або праісці ці прабегчы амаль 105 км. Нават выразная фізічная актыўнасць, у прыватнасці хуткая хада па 45—60 хвілін 4 разы на тыдні на працягу года прыводзіць да зніжэння вагі ўсяго на некалькі кілаграмаў. І тым не менш заняткі фізкультурай варта, але паводле некалькіх карысных правілаў:**

● Працягласць заняткаў павінна быць не менш за 45 хвілін, не радзей за 3 разы на тыдні.

● Перад пачаткам трэніровак прайдзіце абследаванне ва ўрача, каб ведаць, якія нагрузкі можа вытрымаць ваша сардэчна-сасудзістая сістэма.

● Вельмі добра вар'іраваць нагрузкі: дзень — плаванне, другі — хада і г.д.

● Павялічвайце нагрузкі вельмі паступова!

Нават проста хада ў хуткім тэмпе — па 45 хвілін не менш за 3 разы на тыдні — дазволіць актывізаваць сінтэз ферментаў, якія расшчапляюць тлушч, і дастаўку кіслароду ў клеткі. Вызвалены з тлушчавых клетак тлушч накіруецца ў мышачныя клеткі — адзінае месца, дзе тлушч расходуецца.

Захаваць жаданне займацца фізічнымі практыкаваннямі дапамогуць два сродкі.

Першы: разбіце адну доўгую трэніроўку на некалькі больш кароткіх. Паводле звестак даследаванняў, жанчыны з атлусценнем, якія выконваюць аэробныя нагрузкі (пераважна хада) 3 разы на дзень па 10 хвілін 5 дзён на тыдні ў выніку адзначаюць, што затрацілі больш часу на трэніроўкі, чым тыя, хто тую ж нагрузку выконвае па 30 хвілін у дзень 5 дзён на тыдні. Акрамя таго, першыя дасягнулі большага зніжэння вагі.

Другі: падумайце, якое месца для заняткаў — у хатніх умовах ці ў межах спартыўнага клуба — падыходзіць менавіта вам. Важна не тое, дзе менавіта вы будзеце займацца, а тое, наколькі дысцыплінаванымі вы будзеце.

**Вядучая рубрыкі Святлана БАРЫСЕНКА.**

# ДАВАЙЦЕ НЕ БУДЗЕМ ЧАСТАВАЦЬ СУРАГАТАМ...



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Замежнік, які захоча пазнаёміцца з беларускай вёскай, у многіх сучасных аграсядзібах нават і блізка не атрымае ўяўлення аб аўтэнтычным асяроддзі. А яно ў нас ёсць. «Падчас экспедыцый мы бачым помнікі этнаграфіі, народнага дойлідства. Захаваліся аўтэнтычныя сядзібы, якія ўключалі ў сябе і народнае жыллё з разнастайнай планіроўкай (сенцы, святліца, запечча, камора, кладоўка, клець і іншае), павеці, хлявы і іншае. Гэта было кампактна, сумаштабна і камфортна. Трэба паказваць свету, што аб'екты нашага народнага дойлідства не саступалі лепшым узорам нацыянальных культур захаду. Не ў курных, забітых хатах жылі нашы продкі, а ва ўтульных умовах, — заўважае Аляксандр Лакотка. — Сёння абмяркоўваецца глабальная дзяржаўная праграма «Палессе» — па адраджэнню гэтага рэгіёна, якая прадугледжвае ў тым ліку і развіццё турызму, пры гэтым ухіл будзе рабіцца на вясковы турызм. Плануецца, каб у кожным раёне было не менш за 2 турыстычныя цэнтры. І ёсць сэнс ствараць тут усё ж такі традыцыйныя двары, а не ставіць дамы з ацыліндраванай драўніны. Я бачыў, як людзі, якія прыязджаюць з далёкіх куткоў Еўропы альбо з рэгіёнаў Паўднёва-Усходняй Азіі, рукамі водзяць па бярвеннях у хатах, каб праверыць, ці натуральныя яны. Але яны ніколі не будуць мацаць ацыліндраванае бервяно, насычанае ў аўтаклаве антысептыкам. Цяпер плануецца стварыць турысцкі этнагарадок у Мінску, у раёне Чыжоўкі. Я прапаноўваў прыцягнуць аднаўленчыкаў «не тачыць з алоўка» псеўдакорчмы, псеўдазалы, а звезці сюды аўтэнтычныя аб'екты. У шматлікіх гарадах і вёсках мясцовыя ўлады часам не ў стане захаваць многія помнікі драўлянай архітэктуры. Напрыклад, у Оршы ёсць выдатная карчма і унікальныя драўляныя дамы з шыкоўнай разьбой. Такія ж аб'екты ёсць у Магілёве, Віцебску, Гомелі, Бабруйску і нават у Мінску, у раёне Грушаўкі. З усяго гэтага можна стварыць комплекс народнай архітэктуры беларускіх гарадоў. Традыцыйнае дойлідства інвестарам абыдзецца не даражэй, а прыбытку сапраўднае можа даць значна больш. Штучныя сядзібы будуць ствараць аб нас на Захадзе нейкае вульгарнае ўяўленне. Маўляў, мы проста гонімся за маляўнічасцю, і збіраемся праз такі ненатуральны прадукт, часам гэта нават нагадвае дзіцячую гульнявую пляцоўку, збіраць турысцкія грошы».

### Турысты за адраджэнне

Аляксандр Іванавіч упэўнены, што дзякуючы турызму можна стымуляваць беларусаў да адраджэння нашай культуры, традыцый. «Даволі часта мясцовыя жыхары звяртаюцца да мяне: вы толькі падтрымайце нас і мы адродзім нашы рамёствы, нацыянальная культура ў нас стане дамінуючай. І я веру, што гэта цалкам магчыма. Памятаю, калі пачаўся крызіс постперабудовачнага перыяду, і пасля развалу Саюза многія беларускія рэгіёны апынуліся адрэзаныя мяжой ад вялікіх прыбалтыйскіх рэгіёнаў, з якімі раней былі звязаны, сталі глыбінкай, у хатах раптам з'явіліся кросны, людзі пачалі ткаць дываны, габелены і іншае, — расказвае Аляксандр Лакотка. — Дзіўна: вельмі хутка аднавіліся многія народныя промыслы. Я бачыў гэта ў вёсках Пастаўскага і Глыбоцкага раёнаў. У тым жа Моталі (Брэсцкая вобласць) у канцы 80-х рэзка адрадзілася вытворчасць кажухоў, шапак з аўчыны — усё гэта нават стала модным».

Турызм — магчыма, той самы рухавік, які мог бы садзейнічаць захаванню нашых вёсак і малых гарадоў, іх эканамічнаму развіццю. Напрыклад, можна ўзяць некаторыя Скандынаўскія краіны, дзе ў адрозненне ад многіх краін Еўропы захаваліся некранутыя цывілізацыяй глыбінкі. Калі ў той жа Лапландыі былі арганізаваны турысцкія сцежкі на хутары і ў малыя гарады, вельмі шпарка пачалі адраджацца народныя мастацкія і традыцыйныя промыслы, сёння гэта пастаўлена на камерцыйны ўзровень і мясцовае насельніцтва жыве на гэтым.

А чаму б і нам не **рабіць стаўку на народныя промыслы (сакрэт трэці)**? У Беларусі налічваецца каля 100 цэнтраў народных промыслаў і рамёстваў, дзесяткі лакальных раёнаў традыцыйнага ткацтва і вышыўкі, ганчарства, пляцення. Знойдзецца спажывец на традыцыйныя народныя вырабы — іншы пачнуць ткаць, вышываць, плесці з лазы і саломы. А хіба турысту будзе нецікава пасачыць за той жа працай бондара, каваля альбо самому патрапіць «на курсы» па саломапляценні.

На думку навукоўца, у Беларусі недастаткова праводзіцца кірмашоў, фестываляў, выстаў, не хапае цэнтраў традыцыйнай культуры, якія б функцыянавалі круглы год. Нядрэнна было б адрадзіць беларускія кірмашы, якія некалі былі вядомы ў Еўропе, напрыклад, у Зэльве, Давыд-Гарадку, Бездзежы, Гарадной, Высокім, Івянцы, Ракаве. Мы б маглі выкарыстоўваць кірмашы як асаблівую беларускую «фішку». Усё ж гэта не проста продаж сувеніраў, а шэраг традыцый, тут праводзіліся святы, гульні, ладзіліся вяселлі. Этнографы XIX стагоддзя разглядалі кірмашы як крыніцы навуковых ведаў, дзе можна вывучаць народную культуру.

Нашы традыцыі, святы — гэта таксама той каштоўны прадукт, які абавязкова трэба ўжываць у турызме. Тое ж Купалле ў розных рэгіёнах адметна святкавалася, шырока былі вядомы ў Еўропе такія нашы цікавыя абрады, як «пахаванне стралы» на Веткаўшчыне, «ваджэнне куста» ў Жыткавіцкім раёне, Юр'е ў вёсцы Пагост. У нас ёсць прошчы, ростані, святыя горы, крыніцы, камяні, зачараваныя млыны, з якімі звязаны пэўныя абрады, паданні, легенды. Многія з гэтых абрадаў можна рабіць пад заказ, на турыста. Зусім не трэба прыдумляць нейкія легенды, падлог людзі «раскусяць» вельмі хутка. У нас багатая спадчына.

**Сакрэт чацвёрты: аднаўляць, а не прыдумляць наноў.**

### Інфармацыйны голад

На тэрыторыі Беларусі захоўваецца каля 15 тысяч помнікаў, больш як 2 тысячы з якіх могуць выкарыстоўвацца ў турысцка-экскурсійным паказе. А на думку Аляксандра Іванавіча, гэту лічбу можна павялічваць у некалькі разоў, трэба толькі паступова, сістэмна прыводзіць іх у парадак: «Часам ёсць помнік, але гэтае месца зарасло травой, альбо да яго немагчыма дабрацца, многія нашы паркі трэба расчышчаць. Так, сядзібна-паркавых комплексаў у нас вядома каля 900, а дабрацца можна толькі да 150, у турысцкую інфраструктуру ўключана і таго меней. Думаю, трэба адраджаць такія формы грамадскіх работ, як суботнікі, аднаўляць нашы выдатныя мясціны ўсім разам: і сіламі інвестараў, і турысцкіх арганізацый, школ, мясцовых жыхароў, моладзевых арганізацый. Гэта будзе ўздзейнічаць на нашу нацыю, мараль, патрыятызм.

На многім з таго, што зараз лічыцца не патрэбным, можна рабіць турызм. Чаму мы, напрыклад, не выкарыстоўваем такія выдатныя помнікі археалогіі, як гарадзішчы? «Знакамітае гарадзішча на Менцы, за 10 кіламетраў ад сталіцы, магло б стаць цэнтрам кансалідацыі славян, там можна праводзіць выдатныя міжнародныя фестывалі. І каб гэты помнік, як і многія іншыя, стаў сусветнавядомым, трэба не так многа грошай. Неабходна толькі высекчы кустоўе, выкасіць крапіву, прывесці да ладу тэрыторыю, пракласці сцежку, стварыць глядацкую пляцоўку і аўтастаянку, — прапануе Аляксандр Лакотка. — Нават руінаваныя аб'екты могуць выдатна экспанавацца. Трэба іх толькі закансерваваць, замацаваць, расчысціць, прывязаць да інфраструктуры камфорту і насыціць інфармацыяй».

— Рашучае значэнне тут павінна мець інфармацыя. Не візуальнае сузіранне аб'ектаў, а менавіта звесткі, з ім звязаныя, важныя для турызму як аб'екта пазнання, — адзначае Аляксандр Лакотка. — Здавалася б, інфармацыі ў нас дастаткова. Але мы не ўмеем ёй карыстацца, падаваць і, у некаторай меры, захоўваць. Напрыклад, у тым жа Ракаве шмат забудоў, вуліц, ваколіц, звязаных з выдатнымі дзеячамі Беларусі і замежжа. Хіба мы карыстаемся гэтым? У нас не распрацаваныя турысцкія карты, дзе ўсе гэтыя аб'екты будуць не проста пазначаныя значкамі, а насычаныя падрабязнай інфармацыяй. Напрыклад, каб па тым жа Слоніме ці Гродне было распісана ўсё, што можна паглядзець. Няма і аўтамабільных турыстычных картаў, арыентуючыся па якіх можна знайсці найбольш кароткія дарогі з любога кутка Беларусі да помнікаў архітэктуры і культуры. На жаль, не ўдалося нам раскруціць праект, каб інфармацыя пра аб'екты гісторыка-культурнай спадчыны, помнікі прыроды і іншыя, размяшчалася ў сістэме дарожнага сэрвісу (на аўтастаянках, запраўках, пунктах харчавання). Стэнды са звесткамі пра цікавыя месцы ў наваколлі кожнага населенага пункта, гэтак жа як і стэнды на вакзалах, маглі б даволі хутка акупіцца.

У нашай краіне каля 300 музеяў, і інтэрнэт-каталог, дзе б яны былі сістэматызаваныя па тэмах, кірунках, паслугах, прывязцы да пэўнага рэгіёна, таксама быў бы на карысць развіцця турызму...

**Сакрэт пяты: насыціць інфармацыяй.**

### Прапанова для суайчыннікаў

А ці кожны беларус ведае сваю краіну? Ды што там, хоць бы свой горад, вёску, у якой ён жыве. Чым яны славяцца, якая іх гісторыя. Калі нам самім не хапае такой інфармацыі, дык што ўжо тады марыць пра наплыў замежнікаў. І наша краіна тоіць у сабе шмат сакрэтаў, давайце мы самі паспрабуем да іх дабрацца. Аляксандр Іванавіч прапанаваў такія варыянты для падарожнікаў. Што паглядзець з...

*...музеяў:* Беларускі дзяржаўны музей народнай архітэктуры і быту (у Строчыцах), музеі дзеячаў культуры (Купалаўскі і Коласаўскі запаведнік), музеі Оршы, Турава, Полацка.

*...гарадоў:* **Гродна** (Стары і Новы замак, манументальныя ансамблі, зоны гістарычнай забудовы паміж цэнтрам і вуліцай 17 Верасня), **Слонім** (адзіны ў Беларусі горад, які захаваў прыкметы барочнай планіроўкі), **Нясвіж** (адзіны рэнесансны горад), **Мазыр** (другая Швейцарыя, цікавы ландшафт), **Бабруйск** (тэрыторыю крэпасці), а таксама **Давыд-Гарадок, Шклоў, Оршу, Асвею, Браслаў, Відзы, Паставы,** гарады **Нарачанскага краю**.

*...мястэчак:* **Ракаў, Івянец, Зэльву, Свіслач, Целяханы, Урэчча, Капаткевічы, Сялібу, Зэмбін, Даўгінава, Свір, Вараняны.**

*...вёсак:* **Нізок, Наносы, Падарэссе, Ляскавічы, Моталь, Турышчэвічы, Казацкія Балсуны, Пагост.**

*...сядзібаў:* **Залессе** (Агінскага), **Завоссе** (Міцкевіча), **Мерацоўшчына** (Касцюшкі), **Убель** (Манюшкі), прыгожыя сядзібна-паркавыя комплексы — **Раванічы, Высокае, Жылічы, Высокі Бераг, Шчорсы.**

*...цэнтраў народных рамёстваў:* **Поразава** (кераміка), **Моталь** (кажухі, ткацтва), **Гарадная** (кераміка), **Крошын** (кавальства), **Огава** (распісныя куфры).

Для тых, хто хоча зведаць Беларусь, навукоўцамі распрацаваны цэлы спіральны маршрут, які закранае найбольш цікавыя, адметныя мясціны нашай краіны (больш падрабязна з ім можна пазнаёміцца па кніжцы Аляксандра Лакоткі «Гісторыка-культурныя ландшафты Беларусі»). Праехаць яго цалкам магчыма за тыдні тры і на ўласным аўто, і на аўтобусах. Маршрут ужо апрабаваны не толькі навукоўцамі, але і звычайнымі беларусамі, якія такім чынам праводзілі свой адпачынак. Пачынаючы з Мінска, трэба накіравацца ў Нарачанскі край, пасля — на Браслаўшчыну, Полацк, Віцебск, Оршу, Магілёў і наваколле, адтуль — на Чачэрск, Ветку, Добруш, Гомель, пасля — Мазыр, Тураў, Слонім, затым — Нясвіж, Мір, Навагрудак і пад канец у Ліду і Гродна.

**Алена ДЗЯДЗЮЛЯ.**

## БАТЭ ўдала стартаваў у Лізе чэмпіёнаў

**Другі кваліфікацыйны раўнд, з якога БАТЭ пачало сёлета выступленне ў Лізе чэмпіёнаў, каманда амаль прайшла — наўрад ці магчыма, што македонскі клуб «Скоп'е», які ў аўторак абыгралі барысаўчане на чужым полі з лікам 2:0, здолее штосьці змяніць у Барысаве.**

Македонскай камандзе не дапамаглі ні хатнія сцены, ні звыклая для іх спякота (падчас гульні тэмпература не апускалася ніжэй за 30 градусаў). Беларусы асцярожна пачалі, хутка асвоіліся і напрыканцы першага тайма, на 40-й хвіліне, Сяргей Крывец адкрыў лік. У другім тайме вызначыўся барысаўскі форвард Максім Скавыш, які дзеліць з Крыўцом лідарства ў гонцы бамбардзіраў нацыянальнага першынства. Такім чынам, на 49-й хвіліне матча лік стаў 2:0 на карысць беларускага клуба. Македонцы да канца матча нічым не здолелі вызначыцца, адзіная больш-менш рэальная небяспека каля варот Сяргея Верамко ўзнікла на 85-й хвіліне, праўда, мяч у створ варот не трапіў.

Пасля матча **галоўны трэнер барысаўчан Віктар ГАНЧАРЭНКА** адзначыў нязвыклае для беларусаў надвор'е, у якое давялося гуляць у Македоніі. «Было вельмі душна. Але нягледзячы на гэта, мы здолелі прадэманстраваць вельмі сталую гульню». Магчыма, пад сталай гульнёй Ганчарэнка меў на ўвазе і паводзіны сваіх гульцоў, якія не паддаліся на правакацыі. «Мы падоўгу кантралявалі мяч і пазбавілі суперніка магчымасці атакаваць. Галы Крыўца і Скавыша дазволяць нам спакойна рыхтавацца да сустрэчы ў адказ», — падзяліўся трэнер. Трэба дадаць, што спакойна рыхтавацца да сустрэчы ў адказ БАТЭ дазволіць і выдатны настрой пасля першага круга нацыянальнага першынства, дзе БАТЭ ад найбліжэйшага паводле вынікаў суперніка аддзяляе 12 ачкоў.

Гульня ў адказ са «Скоп'е» адбудзецца 21 ліпеня на гарадскім стадыёне Барысава. Як паведамляе сайт барысаўскай каманды, білеты паступяць у продаж 17 ліпеня ў 10 гадзін раніцы ў касы стадыёна. Кошт білета — 10 тысяч рублёў (дзіцячага — 2 тысячы).

**Алена АЎЧЫННІКАВА.**

## «Чарнобыльцы» змогуць атрымаць стыпендыю ў 3,5 тыс. долараў

**Вучоны савет Белдзяржуніверсітэта зацвердзіў палажэнне аб стыпендыі фонду Марыі Шарапавай, памер якой будзе складаць 3500 долараў ЗША, паведамілі ў прэс-службе ўніверсітэта. Такая падтрымка таленавітых студэнтаў БДУ з раёнаў, пацярпелых ад катастрофы на Чарнобыльскай АЭС, з'яўляецца сумеснай ініцыятывай фонду Марыі Шарапавай і Праграмы развіцця ААН.**

Атрымаць стыпендыю змогуць студэнты першага курса дзённага аддзялення — і «платнікі», і «бюджэтнікі». Для ўдзелу ў конкурсе трэба быць грамадзянінам Беларусі (або мець від на жыхарства), мець статус асобы, пацярпелай ад катастрофы на ЧАЭС, альбо жыць не менш за 10 гадоў на забруджанай тэрыторыі, мець патрэбу ў матэрыяльнай дапамозе, актыўна ўдзельнічаць у грамадскай, навуковай, валанцёрскай і іншых відах дзейнасці, мець высокі бал дакумента аб сярэдняй (спецыяльнай) адукацыі.

Вырашаць, каму будзе выплачвацца стыпендыя, будзе адборачная камісія ВНУ, у склад якой уваходзяць прадстаўнікі БДУ, ПРААН і Міністэрства па надзвычайных сітуацыях. Рашэнне пра захаванне стыпендыі ў другім семестры 1 курса і наступных семестрах будзе прымацца з улікам паспяховасці стыпендыята (не менш за 9 балаў па прадметах спецыяльнасці і не менш за 7 балаў па астатніх дысцыплінах) і яго ўдзелу ў грамадскім і навуковым жыцці ўніверсітэта.

Нагадаем, што цікавасць знакамітай тэнісісткі Марыі Шарапавай да Беларусі не выпадковая: ратуючыся ад чарнобыльскай катастрофы, яе бацькі пераехалі з Гомеля ў сібірскі гарадок Нягань, дзе ў 1987 годзе і нарадзілася Марыя.

**Павел БЕРАСНЕЎ.**

## Занатоўкі мастака



### ТЭРТУЛІЯН І АБСУРД

Сто разоў я сам сабе задаваў пытанне: «Ты верыш людзям?» і дзевяноста дзевяць разоў адказваў: «Не веру!» Безумоўна, дзевяноста дзевяць разоў я адказаў разумна. Калі я так адказаў на пытанне пра людзей, дык прыблізна такі ж адказ мусібыць і пра Бога. Што, зноў жа ж — разумна і лагічна. Але вера не лагічная і не разумная, вера абсурдная. Пра абсурднасць веры сказаў Тэртуліян: «Credo quia absurdum est ( Веру, бо абсурдна )». Ніякай іншай веры, акром як абсурднай, не існуе...

### ВЫБІРАННЕ

Заўважыў за сабою такую рысу: заўжды выбіраў сабе жанчыну, што знаходзілася найбліжэй да мяне. Чым бліжэй, тым лепей. Ні прыгажосць, ні розум, ні талент не мелі такога значэння, як адлегласць. Чым бліжэй да мяне жанчына, тым яна разумнейшая, таленавіцейшая і прыгажэйшая ад астатніх.

### ЧОРНЫЯ СЕМКІ

Зімою, пасля вячэры ў мяне ёсць абавязак — засыпаць у пустую кармушку дзве жмені чорных семак. Кожны вечар я сыплю семкі ў кармушку, зробленую з пластыкавай бутэлькі. Аднаго разу я набраў жменю семак, а бутэлька аказалася усё яшчэ поўнай. Чаму сініцы, вераб'і і галубы прапусцілі цэлы дзень і не падзяўблі семкі? Не ведаю. У мяне нават няма часу, каб палюбавацца птушкамі за маімі вокнамі, але ў мяне ёсць час напоўніць кармушку. У наступны вечар яна была па-заўсёднаму пустая, і я насыпаў у яе дзве жмені чорных семак. У які-небудзь з выходных я абавязкова палюбуюся заваконнымі галубамі, вераб'ямі і сініцамі... І што з таго, што ў мяне няма выходных? Некалі я ўсё адно імі палюбуюся без усялякіх абавязкаў.

### ВАЕННАЯ ЭВАЛЮЦЫЯ

Маракі былі самымі рамантычнымі з усіх вайскоўцаў. Ветразі, хвалі, штормы, буры, далёка-далёкія краіны... Маракі былі самымі-самымі, пакуль не з'явіліся лётчыкі. Неба зрабілася блізкім. На змену лётчыкам прыйшлі лётчыкі-касманаўты і лётчыкі-астранаўты. Тут усе хлопчыкі зразумелі, што астранаўтамі-касманаўтамі яны ніколі не стануць. Хлопчыкаў многа, а касманаўтаў-астранаўтаў зусім мала. Тут і адбыўся эвалюцыйны скачок у ваеннай справе. Самымі рамантычнымі ваярамі зрабіліся фінансісты. Не вока за вока, не зуб за зуб, а рубель за рубель, рубель за вока, рубель за зуб. У ваенналюбівых хлопчыкаў зноў ёсць надзея на вялікую перамогу.

### ПІВА І ЗНІЖКІ

Ідзеш па сталіцы, а навокал процьма прапаноў: набудзь, прыдбай, купляй, бяры, пакаштуй, паспрабуй... Хутка слова «зніжкі» пачнуць пісаць большымі і ярчэйшымі літарамі чым пішуцца назвы на крамах. Можа «зніжкі» адразу з металу адліваць і ў назву шыльды ўстаўляць? Не! Хай мастакам-афармляльнікам застаецца іх праца. Фінансавы крызіс, працы і так мала. Хай пішуць пра зніжкі і адсоткі вялізнымі літарамі на ўсю вітрыну. Хай жывуць... З такімі развагамі я ішоў па праспекце, калі мяне перанялі дзве ўсмешлівыя жанчынкі: «Мужчына, мы запрашаем Вас на дэгустацыю новага піва!» Ну трэба ж, піва новае і дармовае наліваюць, а я піва не піў і не п'ю. Пачынаю адмаўляцца, а яны настойваюць... «Чаму Вы мяне запрашаеце?» — «Бо Вы — мужчына!» Так, я сапраўды мужчына, але ад піва дармовага адмовіўся, і камерцыйныя хітрыкі са зніжкамі мяне, шчыра кажучы, не спакушаюць.

### ПАДАТКІ

Пасля паходу ў падатковую інспекцыю ўзнікае неадольнае жаданне выкурыць дзве цыгарэты ўзапар. Дастаткова адной цыгарэты, але жаданне было такое, нібыта я тры дні не паліў тытунь. Пасля размовы з падатковымі інспектарамі мне карціць закурыць. Не скажу, што размова была непрыемнай. Вы спяшаецеся заплаціць падаткі? Спыталі ў мяне. Не спяшаюся... Тады чакайце да першага жніўня. Раней трэба было ўсё аплаціць да пятнаццатага сакавіка... Цяпер інакш, мы да першага жніўня вышлем вам рахунак, а вы яго мусіце аплаціць да першага лістапада. Давядзецца пачакаць... Ад думкі пра доўгае чаканне мне таксама хочацца курыць, як і пасля выхаду з кабінета падатковага інспектара. У маіх сяброў іншая рэакцыя. Некаму цісне пасікаць, некаторым хочацца з'есці трохсотграмовы біфштэкс з крывёю. Маё жаданне самае сціплае. Я выкурыў цыгарэту і задумаў сусешыць сябе невялікім ганарарам за літаратурнаю творчасць. Па свой ганарар я паслаў дачку. Яна атрымала грошы і радасна паведаміла, што ёй далі сто, але ў сотні толькі семдзесят адсоткаў ганарару, таму я вінен рэдакцыі трыццатку. Выдатны ганарар — мінус трыццаць адсоткаў. «А можна падзяліць ганарар сумленна?» — сціпла спытаў я ў сваёй любімай дачкі. «Сумленна — гэта як? — Ты вернеш ім трыццатку, а семдзесят я табе падару. — Абдымаю, цалую...»— смеючыся, сказала добрая дачка і адключыла тэлефон. Ніщто так не суцяшае і не супакойвае чалавека ў фінансавых узаемаадносінах, як круглы нуль.

### ВЯРТАННЕ

Забраў з мастацкага салона дзве свае карціны. Яны там правіселі паўгода і не прадаліся. Ніхто не хоча пераплачваць галерэйшчыкам. Ніхто не хоча аддаваць дадатковыя трыццаць адсоткаў перакупшчыку. Зразумела. Але калі ты нясеш карціны з галерэі ці выставы назад у майстэрню, настрой кепскі. Думаеш пра ўласную бяздарнасць, пра сваю нікому непатрэбнасць, пра свае недальнабачнасць і глупства. На што спадзяваўся, калі рабіў рамы і заносіў карціны ў салон? Вядома, спадзяваўся, што нехта набудзе недарагія палотны. Адно з трох набылі. Суцяшэнне, безумоўна. Але ёсць і выдаткі: адно палатно крыху прадавілі, на другой карціне трохі абабілі раму. Нёс я карціны і сам сябе ганіў і зневажаў. Нават аблайваў сам сябе гнюснымі словамі, ажно пакуль не спусціўся ў падземны пераход. У пераходзе ўсё кардынальна змянілася. Пад зямлёю я, нібыта чалавек, які тоне і дастаў дна, адштурхнуўся ад мінулага і пачаў думаць пра будучае, думаць не пра старыя і непрададзеныя карціны, а пра новыя малюнкі і палотны, пра новыя, яшчэ не выдадзеныя і не дапісаныя кнігі. З падземнага пераходу я выйшаў самаўпэўненым творцам, які верыць у сваю зорку.


### Сведения об объекте республиканской собственности, подлежащем разгосударствлению и приватизации

| Полное и сокращенное наименование объекта разгосударствления и приватизации, его ведомственная принадлежность | | | Республиканское сельскохозяйственное унитарное предприятие "Агрокомбинат "Юбилейный" (РСУП "Агрокомбинат "Юбилейный") Министерство промышленности Республики Беларусь |
|---|---|---|---|
| Адрес | | | 211002, Витебская обл., Оршанский р-н, п/о Заднепровское |
| Вид деятельности объекта разгосударствления и приватизации, укрупненная номенклатура выпускаемой продукции | | | Сельское хозяйство, разведение свиней и крупного рогатого скота, производство мясопродукции, молока, выращивание зерновых и зернобобовых культур |
| Положение на рынке | | | Не занимает доминирующего положения |
| Планируемые сроки разгосударствления и приватизации | | | 3 квартал 2009 г. |
| Предполагаемый способ разгосударствления и приватизации данного объекта | | | Создание открытого акционерного общества |
| Орган, осуществляющий разгосударствление и приватизацию данного объекта, и его местонахождение | | | Витебский областной территориальный фонд государственного имущества 210029, г. Витебск, ул. Правды, 38 |
| Численность работающих, чел. | | | 441 |
| Срок предъявлений претензий | | | Месяц со дня опубликования |
| Предполагаемый размер уставного фонда создаваемого ОАО (начальная цена продажи), рублей | | | 33 415 954 000 |
| Стоимость основных фондов – всего, рублей | | | 36 161 351 000 |
| Площадь земельного участка, занимаемого объектом, га | | | 3244 га, в т.ч. под застройкой – 8 га |
| Наличие принадлежащих предприятию долей (паев, акций) в активах других предприятий, рублей | | | 21 773 000 |
| Объекты интеллектуальной собственности в составе нематериальных активов, руб. | | | нет |
| Финансовое состояние объекта, руб. | Балансовая прибыль | | 1 277 096 |
| | Задолженность | кредиторская | 5 335 922 |
| | | дебиторская | 303 581 |



## ПРОЕКТНАЯ ДЕКЛАРАЦИЯ ОБЪЕКТА ДОЛЕВОГО СТРОИТЕЛЬСТВА

**Первые две секции 7 и 9-этажные 8-секционного многоквартирного жилого дома в составе 1-го пускового комплекса 1-ой очереди строительства «Комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой»**

Совместное общество с ограниченной ответственностью «БЕЛИНТЕ-РОБА» информирует физических и юридических лиц о создании объекта долевого строительства.

**Информация о Застройщике**

Застройщик (Заказчик) – СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА».

Зарегистрировано решением № 653 Минского городского исполнительного комитета от 31 марта 2004 года в Едином государственном регистре юридических лиц и индивидуальных предпринимателей за № 190527399

Адрес Застройщика: 220103, г. Минск, ул. Калиновского, 77а, ком. 320, телефон/факс 281 41 15, 281 21 98.

Режим работы: понедельник – пятница: с 8.30 до 17.30, обед: 13.30 – 14.30, выходные дни: суббота, воскресенье.

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» 31.03.2009 года был сдан в эксплуатацию объект «Многоквартирный жилой дом неповышенной комфортности по ул. Волгоградской, 64» (решение Минского городского исполнительного комитета от 02.04.2009 года № 667).

СООО «БЕЛИНТЕ-РОБА» имеет специальное разрешение (лицензия) № 02250/0463596 на право осуществления деятельности «Проектирование и строительство зданий и сооружений I и II уровней ответственности и проведению инженерных изысканий для этих целей», действительная до 03.03.2013 года, выданная Министерством архитектуры и строительства Республики Беларусь.

**Информация о проекте**

Цель строительства – выполнение инвестиционного проекта «Комплекс жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая» в соответствии с утвержденным Председателем Минского горисполкома протоколом от 22 мая 2007 года.

Строительство «Комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая» планируется осуществить в 4 очереди:

**I очередь:** жилой дом № 1 по г/п, 3 секции многоуровневого автоматизированного паркинга № 4 по г/п, повысительная насосная станция № 5 по г/п, трансформаторная подстанция № 6 по г/п. В составе 1-й очереди выделен 1-й пусковой комплекс в составе 2-х секций жилого дома № 1 (на 7 и 9 этажей), ТП № 6 по г/п.

Срок окончания строительства 1-ой очереди «Комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая» – июль 2011 года.

Информация об объекте долевого строительства:

**Объект долевого строительства** – возведение 1-го пускового комплекса 1-й очереди строительства «комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая» в составе двух секций в осях 11-13 (7 и 9-этажных) 9-секционного многоквартирного жилого дома № 1 со встроенными административными помещениями в подвальном этаже. Начало строительства – июль 2009 года. Продолжительность строительства – 8,5 месяца.

**7-9-этажная часть жилого дома на 69 квартир состоит из двух секций.** Площадь жилого здания – 4628,4 кв.м. Общая площадь квартир (проектная) – 3808,57 кв.м. Здание с подвальным этажом, в котором расположены помещения общественного назначения, и «теплым» техническим чердаком.

Высота этажей (от пола до пола) – 3 м, встроенных помещений подвала (от пола до потолка) – 2,5 м, «теплого» технического чердака – 1,6 м.

Состав квартир на этажах принят:

В 9-этажной поворотной секции в осях «11 - 12» - 2к-2к-2к (1 этаж), 1к-1к-2к-2к (2 - 9 этажи);

В 7-этажной торцевой секции в осях «12 - 13» - 1к-2к-2к-2к (1 этаж), 1к-1к-2к-2к-3к (2…7 этажи).

Секции оборудованы мусоропроводом и пассажирским лифтом грузоподъемностью 630 кг со скоростью 1 м/с.

Конструктивная схема жилого дома – монолитный каркас с монолитными диафрагмами жесткости и монолитными перекрытиями, наружные стены – из блоков ячеистого бетона. Подземная часть здания решена с монолитными наружными стенами.

Внутренняя отделка здания – декоративная штукатурка (места общего пользования), покраска акриловой и масляной краской, облицовка глазурованной керамической плиткой, отделка квартир – подготовка поверхности стен и потолка под отделку. Полы в квартирах – без покрытия, цементно-песчаная стяжка по звукоизоляционному слою. Наружная отделка здания – покраска фасадной краской, облицовка 1 - 3 этажей главного фасада декоративной плиткой на основе минерального сырья. Окна – из ПВХ профиля, стеклопакет. Лоджия – ПВХ профиль, остекление. Двери квартир входные – деревянные щитовые. Сантехническое оборудование – унитаз, счетчики холодной и горячей воды, внутренняя разводка системы водопровода и канализации. Система отопления и вентиляции – приборы отопления, естественная вентиляция.

Объект долевого строительства расположен в Первомайском районе г. Минска в границах улиц Шафарнянская – Гинтовта – Ложинская – Городецкая, на участке площадью 4,75 га. Площадь осваиваемого в составе 1-го пускового комплекса 1-й очереди строительства земельного участка (в границах работ) составляет 0,41 га.

Границами участка служат:

- с северной стороны – ул. Гинтовта с действующей 1-й очередью торгового центра «Дмитриев Кирмаш» и участком незавершенного строительства 2-й очереди;

- с восточной стороны – ул. Ложинская, застройка которой сформирована 9 этажными крупнопанельными и 3-5 этажными индивидуальными жилыми домами микрорайона «Уручье-5»;

- с южной стороны – ул. Городецкая и строящийся офисный и торгово-развлекательный центр «Порт»;

- с западной стороны – благоустроенная рекреационная зона Слепянской водной системы и ул. Шафарнянской.

В составе объекта будут выполнены:

- открытые автопарковки для временного хранения транспортных средств населения суммарной емкостью 22 машино-места;

- площадка для хозяйственных целей, мусоросборник для крупногабаритного мусора,

- временная детская игровая площадка (строительство постоянной запланировано со 2-м пусковым комплексом),

- озелененные дворовые территории.

Строительство прочих обязательных элементов инфраструктуры запланировано в составе последующих очередей.

Согласно Указа Президента Республики Беларусь от 15.06.2006 г. № 396 «О долевом строительстве многоквартирных жилых домов», для привлечения физических и юридических лиц к строительству по договорам создания объекта долевого строительства предлагается 69 квартир стоимостью:

- однокомнатные – общей площадью 42.01 - 46.41 кв.м, стоимостью за 1 кв.м в белорусских рублях в сумме эквивалентной 1 600 долл. США по курсу Национального банка Республики Беларусь на день заключения договора долевого строительства – 29 (двадцать девять) квартир;

- двухкомнатные – общей площадью 58.68 – 63.19 кв.м, стоимостью за 1 кв.м. в белорусских рублях в сумме эквивалентной 1 600 долл. США по курсу Национального банка Республики Беларусь на день заключения договора долевого строительства – 34 (тридцать четыре) квартиры;

- трехкомнатные – общей площадью 79.32 кв.м, стоимостью за 1 кв.м в белорусских рублях в сумме эквивалентной 1 600 долл. США по курсу Национального банка Республики Беларусь на день заключения договора долевого строительства – 6 (шесть) квартир.

Квартиры передаются без чистовой отделки.

Внеквартирные коридоры, лестничные клетки, лифты, лифтовые и иные шахты, коридоры, крыши, технические помещения, другие места общего пользования, несущие, ограждающие ненесущие конструкции, механическое, электрическое, сантехническое и иное оборудование, находящееся за пределами или внутри жилых и (или) нежилых помещений, элементы озеленения и благоустройства, а также иные объекты недвижимости, служащие целевому использованию здания, поступают в общую собственность дольщиков.

Вышеприведенные характеристики подтверждены заключением РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» от 24.06.2009 г. № 1206-5/09.

**Застройщиком получены:**

- акт выбора места размещения земельного участка для строительства объекта «Комплекса жилой застройки неповышенной комфортности в квартале ул. Шафарнянской – Гинтовта – Ложинской – Городецкой» на 4,75 га, утвержденный от 01.09.2008 года Председателем Минского городского исполнительного комитета;

- разрешение Минского городского исполнительного комитета от 26.03.2009 г. № 608;

- разрешение Минского городского исполнительного комитета от 25.06.2009 г. № 1393;

- свидетельство (удостоверение) о государственной регистрации создания земельного участка и возникновения право временного пользования № 500/1032-851;

- проектно-сметная документация, прошедшая в установленном порядке государственную экспертизу, заключение РУП «ГЛАВГОССТРОЙЭКСПЕРТИЗА» от 24.06.2009 г. № 1206-5/09;

- выданное органом государственного строительного надзора разрешение на производство строительно-монтажных работ от 01.07.2009 г. № 2-206Ж-029/09;

- договор генерального строительного подряда . № 001-ГП/2009-У от 27.05.2009 г., заключенный с ООО «АСТРА ИНВЕСТ».

Zepter Bank

ЗАО «ЦЕПТЕР БАНК»
220034, ул. Платонова, 1Б, г. Минск, Беларусь
www.zepterbank.by., эл. адрес: info@zepterbank.by
Тел. (+375 17)331 89 49, факс (+375 17)331 89 48

**БУХГАЛТЕРСКИЙ БАЛАНС на 1 июля 2009 г.**
(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2009 | 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | АКТИВЫ | | | |
| 2 | Денежные средства | 1101 | 548,9 | - |
| 3 | Средства в Национальном банке | 1102 | 1 972,6 | - |
| 4 | Ценные бумаги: | 1103 | 9 707,5 | - |
| | для торговли | 11031 | 1 346,4 | - |
| | удерживаемые до погашения | 11032 | - | - |
| | в наличии для продажи | 11033 | 8 361,1 | - |
| 5 | Кредиты и другие средства в банках | 1105 | 38 403,1 | - |
| 6 | Кредиты клиентам | 1106 | 8 403,4 | - |
| 7 | Долгосрочные финансовые вложения | 1107 | - | - |
| 8 | Основные средства и нематериальные активы | 1108 | 1 198,6 | - |
| 9 | Прочие активы | 1109 | 579,1 | - |
| 10 | ИТОГО активы | 110 | 60 813,2 | - |
| 11 | ОБЯЗАТЕЛЬСТВА | | | |
| 12 | Средства Национального банка | 1202 | - | - |
| 13 | Кредиты и другие средства банков | 1205 | 1 990,9 | - |
| 14 | Средства клиентов | 1206 | 13 200,2 | - |
| 15 | Ценные бумаги, выпущенные банком | 1208 | - | - |
| 16 | Прочие обязательства | 1209 | 1 084,6 | - |
| 17 | ВСЕГО обязательства | 120 | 16 275,7 | - |
| 18 | КАПИТАЛ | | | |
| 19 | Уставный фонд | 1211 | 36 000,0 | - |
| 20 | Эмиссионный доход | 1212 | - | - |
| 21 | Резервный фонд | 1213 | 131,8 | - |
| 22 | Накопленная прибыль | 1214 | 8 420,4 | - |
| 23 | Фонд переоценки статей баланса | 1215 | (-14,7) | - |
| 24 | ВСЕГО капитал | 121 | 44 537,5 | - |
| 25 | ИТОГО обязательства и капитал | 12 | 60 813,2 | - |
| 26 | ТРЕБОВАНИЯ И ОБЯЗАТЕЛЬСТВА НА ВНЕБАЛАНСОВЫХ СЧЕТАХ | | | |
| 27 | Требования | 1301 | 1 697,5 | - |
| 28 | Обязательства | 1302 | 341,6 | - |

**ОТЧЕТ О ПРИБЫЛИ И УБЫТКАХ на 1 июля 2009 г.**
(в миллионах белорусских рублей)

| № п/п | Наименование статьи | Символ | 01.07.2009 | 01.07.2008 |
|---|---|---|---|---|
| 1 | 2 | 3 | 4 | 5 |
| 1 | Процентные доходы | 2011 | 2 165,0 | - |
| 2 | Процентные расходы | 2012 | 239,6 | - |
| 3 | Чистые процентные доходы | 201 | 1 925,4 | - |
| 4 | Комиссионные доходы | 2021 | 59,3 | - |
| 5 | Комиссионные расходы | 2022 | 26,7 | - |
| 6 | Чистые комиссионные доходы | 202 | 32,6 | - |
| 7 | Чистый доход по операциям с иностранной валютой | 203 | 10 678,9 | - |
| 8 | Чистый доход по операциям с ценными бумагами | 204 | 7,3 | - |
| 9 | Доход в форме дивидендов | 205 | - | - |
| 10 | Чистые отчисления в резервы | 206 | 229,9 | - |
| 11 | Прочие доходы | 207 | - | - |
| 12 | Операционные расходы | 208 | 2 486,0 | - |
| 13 | Прочие расходы | 209 | 52,0 | - |
| 14 | Налог на прибыль | 210 | 2 183,8 | - |
| 15 | ПРИБЫЛЬ (УБЫТОК) | 2 | 7 692,5 | - |

**Председатель Правления** **Дворников Игорь Андреевич**
**Главный бухгалтер** **Нестерова Галина Чеславовна**
**Дата подписания «08» июля 2009 г.**

*Лицензия Национального банка Республики Беларусь от 13 ноября 2008 года № 31 на осуществление банковской деятельности. УНП 807000214 БИК 153001820*

## Дзённік фестывалю

# СЛАВЯНСКІЯ АДКРЫЦЦІ — І ЗАКРЫЦЦЁ

**Сёння Віцебск афіцыйна развітваецца з XVIII Міжнародным фестывалем мастацтваў. Для кагосьці, зрэшты, усё толькі пачнецца — увечары ў канцэртнай зале «Віцебск» будуць названыя імёны пераможцаў дзіцячага міжнароднага музычнага конкурсу, з якіх потым, як паказвае практыка, вырастаюць калі не вялікія «зоркі», то ўсё ж сапраўдныя артысты. Аднак большасць удзельнікаў і гасцей «Славянскага базару-2009» збярэцца ў Летнім амфітэатры, каб сказаць: бывай, фестываль! Да сустрэчы налета!**

Увогуле сімвалічна, што якраз на дзень закрыцця, 16 ліпеня, прыпадае Дзень Саюзнай дзяржавы на фестывалі. Бо гэты агульны «дах» аб'ядноўвае тых, хто дарыў і дорыць увесь тыдзень гледачам свае лепшыя песні — ад лаўрэата спецыяльнай прэміі Прэзідэнта Беларусі «Праз мастацтва — да міру і ўзаемаразумення» кампазітара Аляксандры Пахмутавай да артыстаў цырка Юрыя Нікуліна на Цвятным бульвары, ад артгурта «Хор Турэцкага» да беларускага дзяржаўнага заслужанага харэаграфічнага калектыву «Харошкі», ад гурта «БІС» да Іосіфа Кабзона, ад Барыса Маісеева да «Беларускіх песняроў».

На жаль, ідэя сабраць на галоўнай фестывальнай пляцоўцы ўдзельнікаў «Песняроў» розных пакаленняў і сумесным выступленнем адзначыць 40-годдзе легендарнага калектыву так і не ўвасобілася ў жыццё. І ўсё ж адразу дзве іпастасі «Песняроў» віцебская публіка ўбачыла — учора на канцэрце майстроў мастацтваў Беларусі выступілі «Беларускія песняры» і дзяржансамбль «Песняры», пацвердзіўшы, што музыка не мае маскоўскай ці мінскай прапіскі, яна жыве ў нашых сэрцах.

# «СЛАВЯНСКІ БАЗАР» ТРАПІЦЬ У ЭНЦЫКЛАПЕДЫЮ

**Праўда, гаворка ідзе не пра ўвесь мастацкі форум, якому можна было б прысвяціць асобную энцыклапедыю, а пра яго нязменнага кіраўніка — дырэктара фэсту Радзівона Баса. Артыкул аб ім павінен увайсці ў другое, дапоўненае і дапрацаванае выданне «Энцыклапедыі папулярнай музыкі». «Калі не будзе артыкула пра Баса, то выдання ўвогуле не будзе», — запэўніў аўтар і складальнік энцыклапедыі, журналіст, член Саюза пісьменнікаў Беларусі Дзмітрый Падбярэзскі.**

Па шчырасці, гэты зборнік — першае ў нашай краіне выданне такога кшталту — выйшаў з друку яшчэ летась, аднак дагэтуль у Беларусі і тым больш у Расіі мала хто пра яго ведае. Таму аўтар і прыехаў на фестываль асабіста — расказаць пра ўжо запоўненыя «белыя плямы» ў гісторыі беларускай музыкі і пра тое, што засталося іх яшчэ шмат. Усё ж выданне абмежавана пэўнымі часовымі рамкамі, умоўна з 1939 да 2007 года. У ім 570 артыкулаў, прысвечаных як асобным выканаўцам (напрыклад, адкрывае энцыклапедыю па алфавіце спявачка Іскуі Абалян), так і калектывам, а таксама прадстаўнікам прафесій, звязаным з музыкай — прадзюсарам, выдаўцам, гукарэжысёрам, кліпмейкерам.


Фота БЕЛТА.

«Столькі адкрыццяў было зроблена пры складанні гэтага даведніка! Напрыклад, што першы джаз-аркестр БССР насамрэч быў створаны не ў 1940 годзе Эдзі Рознерам, а зусім іншым чалавекам на 2 гады раней. Або што ў рэпертуары выхадцаў з Беларусі, гурта «Бі-2», і цяпер ёсць каля 5 хітоў з рэпертуару бабруйскага гурта «Сонечны бок», вядомага ў 1980-я па фестывалі ЦК камсамола...» — заінтрыгаваў музычных крытыкаў аўтар. Адкрыцці гэтыя, і магчыма нават сенсацыі, працягнуцца ў другім выданні, якое плануецца зрабіць мультымедыйным і для якога ўжо гатова каля 600 артыкулаў. Цікава ж слухачам даведацца, хто ёсць хто ў беларускай музыцы.

# АНЖЭЛІКА АГУРБАШ ПРЫЕХАЛА З ДВУМА ЦЕНЯМІ

**На сольным канцэрце Барыса Маісеева віцебская публіка пачула-такі шырока разрэкламаваны дуэт Барыса і Анжэлікі, песню «Два цені». За кулісамі артысты кранальна віншавалі адно аднаго і сцвярджалі, што цяпер яны не проста добрыя сябры, а «музычныя брат і сястра».**

Спявачка ласкава фатаграфавалася з усімі ахвотнымі, але ад больш цесных кантактаў з прыхільнікамі


Фота БЕЛТА.

яе абаранялі суровы ахоўнік і новая дырэктарка, якія двума ценямі суправаджалі Анжэліку паўсюдна і не дазвалялі лішняга. «А куды падзелася былая дырэктарка і сяброўка — Вольга, жонка мастака Андрэя Смаляка? — недаўменна перашэптваліся журналісты. — Яны ж гадоў 15 сябравалі, так усё добра было». На гэтыя роспыты артыстка адмоўчвалася — але, па чутках, у распадзе гарманічнага сяброўства і партнёрства вінаватыя грошы: ці то муж Анжэлікі, маскоўскі «каўбасны кароль» Мікалай Агурбаш, не пажадаў выкупляць задорага чарговы партрэт жонкі ў мастака, ці то сам Андрэй Смаляк усё ніяк не можа дараваць, што карціну «Кіркораў на асле» расійскі «кароль попмузыкі», добры прыяцель спявачкі, не захацеў набыць ні за якую суму.

Сама Анжэліка ўсім сваім выглядам давала зразумець, што яе гэтыя разборкі ніяк не датычацца і не засмучаюць. Не засмуціла артыстку і тое, што яе дачка, Даша Ялінская, якая сёлета спрабавала прабіцца на конкурс «Новая хваля» ад Беларусі, не прайшла адбор.

— Шчыра кажучы, па-мацярынску, паколькі я бяру ўдзел у лёсе Дашы, я наадварот, толькі ўзрадаваная, — здзівіла прызнаннем Анжэліка. — Бо конкурсы — вельмі няўдзячная рэч. Я ніколі не ўдзельнічала ў вакальных спаборніцтвах, толькі ў конкурсе прыгажосці, куды трапіла выпадкова; адзіны конкурс, у якім я мела шчасце выступаць, — гэта было «Еўрабачанне», — дзякуй, мне хапіла, больш не трэба. І дачцэ гэты шлях я не параіла. Але ў яе ў любым выпадку яшчэ ўсё наперадзе, яна поўная сілаў, гэта прадстаўнік новага пакалення з новымі прагрэсіўнымі поглядамі, у яе свая каманда сяброў — музыкантаў, аранжыроўшчыкаў, дыджэяў, яна сама піша песні на англійскай мове, паціху робіць свой сольны праект.

**Вікторыя ЦЕЛЯШУК.**

## СЁННЯ

**Сонца**

| | Усход | Заход | Даўжыня дня |
|---|---|---|---|
| Мінск — | 4.58 | 21.32 | 16.34 |
| Віцебск — | 4.41 | 21.29 | 16.48 |
| Магілёў — | 4.48 | 21.22 | 16.34 |
| Гомель — | 4.53 | 21.11 | 16.18 |
| Брэст — | 5.15 | 21.46 | 16.31 |
| Гродна — | 5.24 | 21.38 | 16.14 |

**Месяц**
*Апошняя квадра 15 ліпеня. Месяц у сузор'і Цяльца.*

**Імяніны**
*Пр. Аляксандра, Анатолія, Васіля, Піліпа, Сцяпана.*
*К. Марыі, Бенядзікта, Сцяпана.*


Фота Яўгена ПЯСЕЦКАГА.




## Дзве даты — 16 ліпеня

**1944 год** — у Мінску адбыўся грандыёзны мітынг жыхароў горада, прысвечаны вызваленню сталіцы Беларусі. Больш як 50 тысяч гараджан і 30 тысяч партызан запоўнілі тэрыторыю іпадрома. На мітынгу выступілі першы сакратар ЦК КП(б)Б П. Панамарэнка і камандуючы войскамі 3-га Беларускага фронту генерал арміі І. Чарняхоўскі. Мітынг завяршыўся ўрачыстым парадам партызанскіх фарміраванняў.



**1054 год** — папа рымскі Леў IX аб'явіў анафему канстанцінопальскаму патрыярху Міхаілу, што стала пачаткам расколу хрысціянскай царквы на каталіцкую і праваслаўную.

**Цытата дня:**

*«Самы надзейны спосаб запомніць дзень нараджэння сваёй жонкі — забыць яго хоць бы аднойчы».*

**Джозеф Косман.**

# Святая Ганна «прытуліла» рэдкую птушку

**Гродзенскія арнітолагі знайшлі пару драпежнікаў у нішы за статуяй святой Ганны на фасадзе Пабернардынскага касцёла. Пра гэта паведаміў старшыня савета Гродзенскага абласнога аддзялення ГА «Ахова птушак Бацькаўшчыны» Дзмітрый Вінчэўскі.**

Паводле яго слоў, гэта адзіная пара пустэльгаў, якая ўгняздзілася ў Гродне. У птушак вывелася сем птушанят, якія ўжо вылецелі з гнязда. Як расказаў арнітолагам настаяцель касцёла, гэтых прыгожых буйных птушак у нішы храма ён заўважаў некалькі гадоў запар. Яшчэ адна пара птушак спрабуе ўгнездзіцца на тэлевізійнай вышцы, але адтуль яе праганяюць людзі.

Наогул жа пустальга ў гарадах Беларусі сустракаецца рэдка. Тры-чатыры дзясяткі птушак апошнім часам угняздзіліся ў Брэсце. Пустальга занесена ў Чырвоную кнігу Беларусі. Усяго ў краіне, па ацэнках спецыялістаў, налічваецца 1,2 тыс. пар сокалаў-пустэльгаў.

Вастрыня зроку пустальгі вышэйшая за чалавечую ў 2,6 раза. Чалавек з такім зрокам мог бы прачытаць усю табліцу для праверкі зроку з адлегласці 90 м.

**БЕЛТА.**

## Навіны сталіцы

# У Мінску пабудуюць падземныя тунэлі

**У сталіцы мяркуецца будаўніцтва трох падземных транспартных тунэляў. Такія планы закладзены ў карэктуры Генеральнага плана развіцця сталіцы да 2030 года.**

Як расказалі ў КУП «Мінскграда», першы тунэль будзе пачаты на вуліцы Акадэмічнай і выйдзе на вуліцу Сурганава за праспектам Незалежнасці. Другі звяжа вуліцу Жукоўскага (на скрыжаванні з Магілёўскай) з вуліцай Ульянаўскай (за вуліцай Свярдлова). Трэці пачнецца ад вуліцы Леніна (за скрыжаваннем з вуліцай Ульянаўскай) і выйдзе на праспект Пераможцаў у раёне яго скрыжавання з вуліцай Багдановіча. Гэта дазволіць павялічыць прапускную здольнасць на самых «вузкіх» і складаных участках вулічна-дарожнай сеткі горада. Адзначым, што пакуль гэта толькі стратэгія развіцця транспартнай сеткі Мінска. Яе рэалізацыя патрабуе вялікіх капіталаўкладанняў.

**Вольга ЖАРЫНА, «Мінск—Навіны».**

## МАК

● На Мокія, у Макаў дзень, пачыналі збіраць мак. На Русі мак шырока выкарыстоўвалі пры выпяканні булак, ватрушак і караваяў і г.д. Здавён ведалі снатворнае дзеянне маку. Мак выкарыстоўвалі таксама і як ахоўны сродак супраць «дурнога» вока і ведзьмакоў.

● Гэты дзень лічыўся нешчаслівым, таму непажадана было пачынаць ці працягваць якія-небудзь справы. Увогуле ў гэты дзень трэба было быць вельмі асцярожнымі.

**Мак — расліна з чырвонай, пунсовай, радзей белай ці жоўтай кветкай, якая ў культуры розных народаў сімвалізавала сон: сны чалавека, часам прарочыя, зімовы сон прыроды і г.д. Часам мак сімвалізаваў уваскрэсенне пасля смерці. У некаторых рэгіёнах выява маку выкарыстоўвалася ў арнаментальных вышыўках, была атаясамленнем ранішняга свету, досвітку, здароўя і прыгажосці.**

● Народныя знахары выкарыстоўвалі сок маку як абязбольвальны і снатворны сродак. Часта ўжывалі мак для лячэння эпілепсіі. З цягам часу людзі навучыліся атрымліваць з маку сродкі моцнага ўздзеяння на псіхіку чалавека — наркотыкі опій і морфій.

● Насенне маку выкарыстоўвалі ў якасці абярэга ад нечаканага госця і ліхога вока. Для гэтага неабходна было апоўначы прачытаць на мак спецыяльную замову і рассыпаць насенне па «межах» свайго падворка.

### Калі чалавек палахлівы

Здараецца так, што чалавек чагосьці спалохаўся, яго сурочылі, і жыццё яго ператвараецца ў жах. Каб яму дапамагчы, трэба прачытаць на мак наступную замову і абсыпаць чалавека гэтым насеннем:

*«У рабы (імя) сонца перад вачыма, яго месяц за плячыма, зоркі над галавой. Месячыкам раб (імя) падвяжацца, нічога не будзе баяцца. Устаньце яму на помач, уся Святая Прытча, каб ворагі не маглі ні галавы падняць, ні дрэннага слова супраць яго казаць. Шэры мак — раскаціся, усе ворагі — разыдзіцеся!»*

**Аксана КАТОВІЧ, Янка КРУК.**

## Крынічка

«Цякла тут з лесу невялічка
Травой заросшая крынічка».
Якуб КОЛАС.

Рубрыку вядзе Валянціна ШПІЛЕЎСКАЯ, тэл. 285 88 81 — № 22 (311)

# Як абрываць пасынкі ў памідораў?

*«Раскажыце, як правільна пасынкаваць памідоры».*
**В. Осіпава,** *Мінскі раён.*

Характар пасынкавання залежыць ад біялагічных асаблівасцяў гатунку і ад месца іх вырошчвання. Высакарослыя гатункі і гібрыды пасынкаваць вельмі проста. Іх фарміруюць у адно сцябло. Галоўнае — своечасова выдаляць пасынкі з кожнай пазухі лістоў, калі яны адрастаюць не больш як 5 см. Пасынкі можна прышчыкваць кожны тыдзень, як толькі яны адрастаюць да такой велічыні, каб за іх можна было ўхапіцца двума пальцамі. Іх трэба выломліваць, а не зразаць, каб не заразіць расліну віруснымі хваробамі. Калі сфарміруецца 8-10 гронак, у расліны прышчыкваюць вярхушку. У плёначных цяпліцах пры сонечным абагрэве расліны таматаў не паспяваюць сфарміраваць такой колькасці гронак, таму іх прышчыкванне робяць ў пачатку—сярэдзіне жніўня, каб плады, якія сфарміраваліся, паспелі выспець.

Сярэднярослыя гібрыды патрабуюць іншага падыходу. Да 3-4-й гронкі ў іх таксама выдаляюць усе бакавыя парасткі, але затым над 3-4-й гронкай пакідаюць адзін, больш моцны, а асноўнае сцябло прышчыкваюць. Гэта робяць для таго, каб узмацніць роставыя працэсы, якія ў гэтых гібрыдаў затухаюць да моманту фарміравання 4-5-й гронкі.



Менш працаёмістае выдаленне бакавых парасткаў у нізкарослых гатункаў тамату (напрыклад, Ранні 83, Белы наліў і інш.). Не варта надта захапляцца пасынкаваннем, асабліва выдаляць вялікія пасынкі, можна ўвогуле страціць ураджай. Таму спачатку выдаляюць парасткі з пазух 5-6-га лістоў, а толькі потым тыя, у якіх увогуле не ўтвараюцца гронкі. Каб плады былі больш буйнымі, можна выломліваць і частку пасынкаў з гронкамі, але так, каб на расліне заставалася не больш як 8-10 гронак.

Майце на ўвазе, што не пазней чым 25 ліпеня на таматах прышчыкваюць вярхушкі як асноўных, так і бакавых сцёблаў, каб ураджай выспеў да восені.

## Яшчэ можна ў ліпені...

Пасля збору першага ўраджаю на вызваленыя ад папярэдніх раслін градкі, у тым ліку пад плёнку, можна пасадзіць такія хуткаспелыя культуры, як радыску, цыбулю на пяро, салату, шпінат, шчаўе і інш. Іх высаджваюць на ўрадлівыя, добра ўгноеныя і чыстыя ад пустазелля ўчасткі. Перад пасадкай градкі шчодра паліваюць. Ведайце, што летнім усходам патрабуецца больш часты паліў, чым веснавым.

Радыску можна высяваць у адкрыты грунт аж да верасня. Да восені, прыкладна праз 8 тыдняў, караняплоды сфарміруюцца.

Пасля 15—20 ліпеня высяваюць чорную рэдзьку і дайкон для асенне-зімовага спажывання (раней нельга, інакш яны пойдуць у стрэлку). Іх можна высяваць да канца ліпеня. Дайкон (культура, якая прыйшла да нас з Японіі) можа замяніць познюю радыску. На смак дайкон падобны на радыску, але не горкі, да таго ж ён больш карысны. Клопатаў з ім менш і захоўваецца даўжэй.

## Гаспадыні на заметку

● Таматнае пюрэ, якое пачынае псавацца, можна выкарыстаць, калі добра праварыць яго і дадаць солі.

● У слоіку з кансерваванай агароднінай памутнеў марынад. Дастаньце агародніну, прамыйце, пакладзіце ў чысты слоік і заліце новым, больш моцным марынадам. Можна выкарыстаць і стары марынад, калі яго прафільтраваць і дабавіць крыху воцату.

● Калі забрадзіла варэнне або павідла, перакладзіце яго ў каструлю, нагрэйце да кіпення і дабаўце 50—100 г цукру на 1 кг.

● Варэнне зацукроўваецца, калі яно перапарана, калі ў ім больш цукру, чым трэба, або яно захоўвацца ў цёплым месцы. Калі гэта здарылася, трэба пакласці яго ў каструлю, наліць гарачай вады (шклянку на кілаграм) і давесці да кіпення. Можна зрабіць і так: паставіць слоікі з варэннем у цёплую ваду і награць яе да кіпення, і тады цукар ў слоіках растворыцца.

● Калі варэнне недаварана ці ў ім мала цукру, яно можа забрадзіць, з'явіцца спіртавы пах. Выліце яго ў сіроп, які закіпеў (500 г цукру на кілаграм варэння), і варыце да таго часу, пакуль яно не перастане пеніцца.

* * *

● Калі трэба зварыць як мага хутчэй бульбу, пакладзіце ў яе лыжку маргарыну.

● Каб не было непрыемнага паху пры варцы капусты або рэпы, апусціце ў каструлю лустачку хлеба, загорнутую ў чыстую тканіну.

● Фасоля будзе больш смачная і карысная, калі ваду, у якой яна варыцца, адразу зліць пасля закіпання. Затым зноў заліць фасолю халоднай вадой, дадаць дзве-тры лыжкі алею і варыць да гатоўнасці.

● Нарэзаная цыбуля-рэпка захавае свежасць, калі пакласці яе на сподачак, пасыпаны соллю.

● Булён будзе залацістым, калі дабавіць у яго крыху прамытага шалупіння цыбулі.

# «Стрыжка» для агуркоў

Добры ўраджай агуркоў можна атрымаць шляхам фарміравання раслін, калі своечасова пакарочваць бакавыя парасткі. Пасля гэтага расліны будуць не толькі лепш развівацца і пладаносіць, але і менш паражацца грыбковымі захворваннямі. Калі вы хочаце збіраць ураджай да восені, тады расліны цяплічных агуркоў абавязкова трэба фарміраваць. Бо на галоўнай сцябліне вырастае толькі трэць ураджаю, усе астатнія — на бакавых парастках. Расліна не можа пракарміць растучыя плады, яны асыпаюцца, таму бакавыя парасткі рэкамендуецца прышчыкваць. Каб падоўжыць плоданашэнне, вырасціце агуркі на галоўнай сцябліне, а затым на бакавых парастках. Фарміруючы расліну агурка ў пазухах ніжніх трох-чатырох лістоў, сарвіце ўсе кветкі і бакавыя парасткі. Лісты абразаць не трэба.

Першы раз выдаляюць пупышку росту, калі з'яўляецца другі сапраўдны ліст. Другі раз агуркі прышчыкваюць над 5-6-м ці 6-7-м лістом. Часам другое прышчыкванне робяць над 8-9-м лістом на бакавых парастках. Надалей па меры росту галоўнай сцябліны рэгулярна раз на тыдзень прышчыкваюць бакавыя парасткі: да вышыні аднаго метра пакідаюць на іх адзін-два лісты і адзін плод; вышэй, да 1,5 м — два-тры лісты і два плады, далей — тры-чатыры лісты і тры плады.

Лісты, паражоныя хваробай, і парасткі, што засохлі ці адпладаносілі, зразаюць вострым нажом, не пакідаючы пянькоў. Лісты і парасткі лепш абразаць толькі ў першай палове дня, каб да вечара ранкі падсохлі. Пажоўклыя здаровыя лісты абразаць не трэба, а каб лісты не жоўклі знізу, сачыце за тым, каб не было зацянення расліны зверху.

Агуркі ў адкрытым грунце не фарміруюць, а акуратна раскладваюць плеці і прышпільваюць іх да зямлі. Галоўнае — размеркаваць плеці на градцы, не дапусціць іх загушчэння. Спецыялісты рэкамендуюць падвязваць грунтовыя агуркі, каб расліны не разрасліся ў суцэльны дыван. Для гэтага ў сярэдзіне градкі трэба ўтыркнуць калкі, прымацаваць зверху рэйку і перакінуць плеці цераз іх. Шпалерны спосаб вырошчвання агуркоў мае шэраг пераваг: па-першае, расліны раўнамерна асвятляюцца сонцам, лепш праграваюцца, па-другое, пры такім спосабе вырошчвання атрымліваецца больш высокі ўраджай, плады — добрыя на смак, таму што ў агуркоў ёсць такая прыродная асаблівасць: яны цягнуцца да святла, падстаўляючы пад сонца свае лісты, і ў той жа час хаваюць у цень плады.



**КАРЫСНЫЯ ПАРАДЫ**

❒ Раз у 7-10 дзён агуркі падкормліваюць, чаргуючы арганічныя ўгнаенні з фосфарнымі і калійнымі. Калі вельмі горача, то пасля 15 гадзін агуркам робяць асвяжальны душ. Раніцай гэту працэдуру рабіць не варта, таму што пры апыленні пчоламі лісты і кветкі павінны быць сухімі.

❒ Па знешнім выглядзе агуркоў можна меркаваць аб тым, ці хапае раслінам элементаў сілкавання. Жоўтыя лісты сведчаць аб недахопе ў глебе магнію. Калі плеці тонкія, лісты дробныя, самі плады святлейшыя, чым звычайна, а вярхушкі іх звужаны і завостраны, падкарміце іх азотнымі ўгнаеннямі. Развядзіце запалкавы пачак аміячнай салетры на вядро вады, або 1 л настоянага каравяку на вядро вады (расходаваць па паўлітра на расліну). Калі лісты і плеці цёмна-зялёныя і буйна растуць, не давайце азотнай падкормкі, інакш доўга давядзецца чакаць ураджаю. Калі агуркі, незалежна ад гатунку, круглыя, а ля пладаножкі рэзка звужаюцца, утвараючы «хвасты», раслінам не хапае калію: падкарміце іх настоем драўніннага попелу (1 шклянка на вядро вады).

❒ Пад корань кожнай расліны вельмі карысна ў ліпені падсыпаць перагной ці кампосную зямлю. Гэта дасць ім дадатковае сілкаванне.

❒ Выбіраць агуркі пажадана ў другой палове дня і з самага ранку, з расой.

## Усміхнёмся!

**Выйшла замуж за механіка. Нарадзілася шасцярня.**

☺

Чым адрозніваецца футбол у Бразіліі ад футбола ў Беларусі?

У Бразіліі народ сядзіць каля тэлевізара з півам і думае: «Як хлопцам пашанцавала — за зборную гуляюць!»

У Беларусі футбалісты бегаюць па полі і думаюць: «Як хлопцам пашанцавала — сядзяць дома каля тэлевізара, піва п'юць!»

☺

**Густ і колер — добрая падстава для бойкі.**

☺

Жанчына — настаўніцы пачатковых класаў:

— Вы ведаеце, даражэнькая, мая дачушка такая разумненькая — ёй усяго пяць гадкоў, а яна ўжо вывучае французскую і алгебру.

Машачка, скажы цётачцы «прывітанне» на алгебры!



Віншую дарагога мужа **МЫЧКО Уладзіміра Міхайлавіча** з днём нараджэння. Жадаю моцнага здароўя, шчасця, усяго самага добрага.

*76 табою пражыта гадоў.*
*Многа рознага было ў жыцці.*
*Я жадаю, каб сэрца тваё абышлі стараной*
*Смутак, боль і подых журбы.*

**Жонка.**

ЗВЯЗДА
БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА
ЗАСНАВАЛЬНІКІ: Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Савет Міністраў Рэспублікі Беларусь
РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ НУМАР 2 АД 17 ЛЮТАГА 2009 ГОДА.

Галоўны рэдактар У. НАРКЕВІЧ. РЭДАКЦЫЙНАЯ КАЛЕГІЯ: І. БАРАНОЎСКІ, С. ГРЫБ, У. ЗДАНОВІЧ (намеснік галоўнага рэдактара), Н. КАРПЕНКА, Л. ЛАХМАНЕНКА, С. ПРОТАС (намеснік галоўнага рэдактара), С. РАСОЛЬКА, Л. РЫЖАНКОВА (першы намеснік галоўнага рэдактара), Л. СВІДРЫЦКАЯ, А. СЛАНЕЎСКІ (намеснік галоўнага рэдактара), В. ЦЕЛЯШУК, Л. ЦІМОШЫК, І. ШЧУЧЭНКА.
НАШ АДРАС: 220013 г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.
ТЭЛЕФОНЫ: прыёмнай — 287 19 19 (тэл./факс); аддзелаў: пісьмаў — 287 18 64, падпіскі і распаўсюджвання — 287 18 36, 287 18 51, юрыдычнага — 287 19 68, сакратарыята — 292 05 82, адказных за выпуск дадаткаў: «Чырвоная змена» — 292 44 12; «Мясцовае самакіраванне» — 292 21 03, уласных карэспандэнтаў: у Брэсце: 20 37 98, Віцебску: 43 23 74, Гродне: 43 25 29, Гомелі: 74 13 92, Баранавічах: 47 26 02, Магілёве: 32 74 31; бухгалтэрыі: 292 22 03; прыём рэкламы тэл./факс: 287 17 79, e-mail: reklama@zvyazda.minsk.by, рэдактар рэкламнага аддзела — тэл./факс 292 04 52.
http://www.zviazda.by;
e-mail: info@zvyazda.minsk.by
Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні не заўсёды супадаюць з меркаваннем рэдакцыі. Рэдакцыя па сваім меркаванні адбірае і публікуе адрасаваныя ёй пісьмы. Перадрук матэрыялаў, апублікаваных у «Звяздзе», толькі з дазволу рэдакцыі.

Матэрыялы, пазначаныя гэтым значком, носяць рэкламны характар. Адказнасць за змест рэкламы нясуць рэкламадаўцы.
Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79. Выходзіць 250 разоў на год.
Тыраж 32.345. Індэкс 63850. Зак. № 3819. Нумар падпісаны ў 19.30.
М 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12
П 1 2 3 4 5 6 7 8 9 10 11 12